ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 27 (1063) ● Чацвер, 3 кастрычніка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## ДЭКАДА СТУДЭНЦКІХ СПРАЎ

Камітэт камсамола універсітэта ўключыўся ў падрыхтоўку да правядзення «Дэкады студэнцтва», прысвечанай 30-годдзю перамогі над фашысцкай Германіяй і 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

18—19 кастрычніка пройдуць пад дэвізам «Табе, Радзіма, ударная праца».

20—22 кастрычніка — «Мы памятаем тых, чые імёны на подзвігі клічуць».

Наступныя 23—24 кастрычніка носяць назву «Тваё слова навуцы, студэнт».

25—26 кастрычніка — «Студэнцкая моладзь — піянерыі» прысвечаны шэфскім сувязям студэнтаў са школьнікамі.

А вось 27 і 28 кастрычніка будуць адзначацца на стадыёнах і спартыўных пляцоўках пад лозунгам «Ад значка ГПА — да алімпійскага медаля».

І, нарэшце, 29—31 кастрычніка будуць днямі «Студэнцкая моладзь — прафтэхадукацыі».

## ВУЧОБА ПАЧАЛАСЯ

Першага кастрычніка, як і ўсюды ва універсітэце, пачаліся заняткі філасофскага семінара геаграфічнага факультэта. У складзе слухачоў — супрацоўнікі лабараторый возеразнаўства, глебазнаўства, лабаранты кафедр. Ужо шосты год працуе гэты семінар, выбраўшы сваёй тэматыкай праблемы марксісцка-ленінскай філасофіі.

Вялікі інтарэс выклікала вывучэнне працы У. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Асабліва дэталёва разбіралася тэма аб саюзе філасофіі і прыродазнаўства. Гэта паслужыла метадалагічнай асновай для далейшай работы.

На працягу доўгага часу ўдзельнікі семінара вывучалі тэму «Узаемадзеянне прыроды і грамадства» ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Пры вывучэнні тэмы супрацоўнікі лабараторый падрыхтавалі навуковыя даклады. Асабліва добрымі, з выкарыстаннем канкрэтных матэрыялаў прыродазнаўчых навук і палявых даследаванняў былі даклады А. А. Серафімовіча «Рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў і ахова іх ад забруджвання», І. Б. Белавусавай «Роля КПСС і Савецкай дзяржавы ў далейшым паляпшэнні аховы прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў».

Асабліва актыўна ў рабоце семінара ўдзельнічалі Л. М. Лапаткіна, Н. Н. Івахненка, Н. Н. Лопух, Л. Ф. Вашкевіч і іншыя. Добрым арганізатарам і памочнікам прапагандыста з'яўляецца староста С. Ф. Тумішская.

У гэтым навучальным годзе па жаданню слухачоў вывучаецца праблема грамадскай свядомасці. Пазаўчора на першых занятках былі разгледжаны сутнасць, структура і формы грамадскай свядомасці. Асабліва вялікая ўвага была звернута на задачы ідэалагічнай работы партыі, якія знайшлі адлюстраванне ў пастанове ЦК КПСС «Аб рабоце ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя М. Э. Баумана і Саратаўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Г. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук» і пастанове ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі».

На першых занятках быў зроблен агляд літаратуры па праблемах грамадскай свядомасці. На наступных занятках будуць заслуханы і абмеркаваны даклады тт. Серафімовіча і Уласава на тэмы: «Марксісцка-ленінская ідэалогія, яе асаблівасці і роля ў будаўніцтве камунізму» і «Крызіс сучаснай буржуазнай ідэалогіі. Крытыка антыкамунізму, левага і правага рэвізіянізму».

**Э. КЛЁСАВА,**
**кіраўнік семінара, дацэнт.**

## КОНКУРС НАВУКОВАЙ ТВОРЧАСЦІ

**Бюро ЦК ЛКСМБ і калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прынялі пастанову «Аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ Беларускай ССР па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках у 1974—1975 навучальным годзе».**

У пастанове адзначаецца, што правядзенне ў рэспубліцы штогадовых аглядаў-конкурсаў навуковых работ студэнтаў стала традыцыяй і садзейнічае далейшаму развіццю навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, павышэнню якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у вышэйшых навучальных установах. Аб гэтым сведчаць вынікі мінулагодняга конкурсу, які паказаў узросшую актыўнасць удзелу студэнтаў у навукова-даследчай рабоце, павышэнне ўзроўню і якасці студэнцкіх даследаванняў, якія ахопліваюць многія актуальныя пытанні навукі, тэхнікі, культуры і мастацтва. З трох тысяч трохсот трох навуковых работ, прадстаўленых на конкурс ВНУ рэспублікі ў мінулым навучальным годзе, 905 аднесены да 1-й катэгорыі. Многія з іх укараняюцца ў вытворчасць ці выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе.

З мэтай далейшага развіцця навукова-даследчай работы студэнтаў і шырокага прыцягнення іх да творчага пошуку пастановай прадугледжана правядзенне рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ Беларускай ССР на сёлетні навучальны год.

Зацверджана палажэнне аб конкурсе, у якім прадугледжана, што ўдзел у конкурсе могуць прымаць студэнты дзённых, вячэрніх і завочных аддзяленняў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, а таксама студэнты замежных краін, якія вучацца ў БССР. На рэспубліканскі конкурс прадстаўляюцца лепшыя навуковыя работы, адабраныя па выніках конкурсаў у ВНУ пасля абмеркавання на кафедрах, у навуковых гуртках і на студэнцкіх навуковых канферэнцыях.

Для заахвочвання за лепшыя навуковыя работы студэнтаў устаноўлена 65 прэмій па ўсіх раздзелах навукі і тэхнікі. Аўтары лепшых работ атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі, ім будзе прысвоена званне лаўрэатаў конкурсу. Узнагароджвацца будуць таксама навуковыя кіраўнікі работ, адзначаных прэміямі, а таксама тыя ВНУ, чые прадстаўнікі дасягнуць найлепшых вынікаў у рэспубліканскім конкурсе.

Пастанова абавязвае кіраўніцтва вышэйшых навучальных устаноў, абкомы ЛКСМБ, камітэты камсамола, саветы СНТ ВНУ забяспечыць шырокі ўдзел студэнтаў у рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках.

## БУДЗЬЦЕ ЗАЎЖДЫ МАЛАДЫМІ!

СТУДЭНЦКІЯ гады! Гэта такая пара ў жыцці чалавека, якая ўваходзіць у яго існаванне завяззю будучых здзяйсненняў. Бо, пераступаючы парог ВНУ, чалавек не проста перасаджваецца са школьнай парты на студэнцкую, не проста прысвячае сябе свету ведаў. Ён прысягае на вернасць справе, якая стане галоўнай на ўсё жыццё. Ён выбірае назаўсёды сваю прафесію, сваё месца ў жыцці.

Мы з хваляваннем чакалі будучых абітурыентаў. Работнікі ВНУ разумеюць: ад таго, наколькі добра яны выявяць веды і здольнасці паступаючых, у многім будзе залежаць узровень спецыялістаў, якім яны выдадуць дыпломы ў 1979 годзе. Больш таго, прыём у ВНУ — адна з буйных сацыяльных праблем нашага часу.

Нялёгкая задача — адабраць дастойных, ведаючых, здольных. Бо разглядзець за знешне бліскучымі адказамі вельмі пасрэдную асобу або талент у межах радавога адказу — задача вышэйшай педагагічнай цяжкасці.

Школа сённяшняга дня, якая трымае курс на ўсеагульную сярэднюю адукацыю, дае сваім выхаванцам неабходны аб'ём ведаў, але не можа дабіцца ад кожнага актыўнага выкарыстання гэтых ведаў.

Некаторыя школьнікі толькі на парозе ВНУ пачынаюць разумець, што веды ў іх слабыя. Бацькі кідаюцца на пошукі «хуткай дапамогі» — рэпетытара. Значыць, адна з прычын, якія штурхаюць да рэпетытара,—недастатковая актыўнасць самога школьніка ў вучобе і магчымасць атрымаць у школе станоўчую адзнаку без свядомага, актыўнага засвойвання асноў навук.

Вялікія прагалы і ў прафарыентацыі. Ну, ці не кур'ёз: хлопец абышоў усю прыёмную камісію і вярнуўся ў сакратарыят, заявіўшы, што няма прыёму на юрыдычны факультэт. І як жа ён здзівіўся, калі даведаўся, што таблічка «Правазнаўства» і ёсць шукаемае.

Быў і такі выпадак. Абітурыентка геаграфічнага факультэта не здавала экзамен, а сама сабе паставіла адзнаку «добра» і прыйшла забраць дакументы.

На пытанне, чаму яна так зрабіла, адказала:

— Я не збіралася сюды паступаць.

— Чаму ж вы тады здалі дакументы?

— Дома прымусілі.

Канешне, прыклад экстраардынарны, аб ім не трэба было б

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ТУРБОТЫ ЎБОРАЧНАЙ

З першых жа дзён сельскагаспадарчых работ многія атрады працавалі ў высокім тэмпе. Напрыклад, студэнты чацвёртай групы III курса гістфака выконвалі дзённыя нормы на 115—135 працэнтаў.

Добрыя водгукі аб рабоце атрымалі другакурснікі ФПМ, якія дапамагалі саўгасам «Рагоўскі», «Савецкі» Мінскага раёна. Старанна працавалі ў Віцебскай вобласці першакурснікі фізічнага факультэта. Але побач са станоўчымі фактамі ўсё ж такі прыходзіцца адзначыць і непрыемныя.

Саўгас «Ждановічы» Мінскага раёна прыняў 200 студэнтаў фізфака. У брыгадзе Г. Малахоўскага была дрэнная дысцыпліна, да работы тут адносіліся халатна, дзённых норм не выконвалі. Адначасова суседняя брыгада Цэдрыка кожны дзень перавыконвала нормы. Вывад напрошваецца адзін: перад ад'ездам студэнтаў на ўборку не перад усімі з іх былі ясна пастаўлены камітэтам камсамола фізфака тыя задачы, выкананне якіх патрабуюць умовы ўборкі, што склаліся ў гэтым годзе. Дэканат і камсамольскае бюро фізічнага факультэта прынялі меры па паляпшэнню дысцыпліны сярод студэнтаў: у 16 з іх знята стыпендыя, 6 аб'яўлены вымовы.

Амаль усе групы вялі агітацыйна – прапагандысцкую работу сярод мясцовых жыхароў, выступалі з лекцыямі і канцэртамі. Але не ўсюды гэта работа вялася на здавальняючым узроўні.

Камітэтам камсамола факультэтаў трэба зрабіць вывады з гэтых вынікаў і больш рупліва рыхтавацца да ўборкі ў наступным годзе.

**А. КЛІМОВІЧ.**

Фота **Д. Прэса.**



**Добра працавалі на ўборцы буракоў другакурснікі-эканомгеографы.**

## 6 КАСТРЫЧНІКА—ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА

**Валерый ДРАНЧУК**

**Мы ад настаўнікаў паходзім**
**(праслаў жыццём вучнёўства час!)**
**Не мы настаўнікаў знаходзім —**
**настаўнікі знаходзяць нас.**

**Яны шукалі нас гадамі,**
**а мы — шукальнікі прыгод —**
**ні ўдзячным жэстам, ні тастамі**
**не адзначалі іх прыход.**

**Буялі маі ў звонкіх кронах,**
**І мы шчаслівымі былі.**
**А што зіма цвіла на скронях,**
**мы сэрцам бачыць не маглі.**

**Мы —**
**ад настаўнікаў паходзім.**
**І, пасталелыя ў гадах,**
**мы зноў і зноў да іх прыходзім**
**па імі ўзведзеных мастах.**



*Фаціма Радлінская, студэнтка V курса гістфака, пакуль што практыкантка. Але вельмі хутка яна стане сапраўднай настаўніцай і павядзе за сабой у краіну ведаў цікаўных вучняў.*

*Фота А. ЦЫГУЛЕВА.*

# БУДЗЬЦЕ ЗАЎЖДЫ МАЛАДЫМІ!

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

успамінаць. Але памылка ў выбары любой прафесіі небяспечна. І яна ў многа разоў цяжэйшая, калі чалавек памыліўся ў выбары прафесіі педагога. За гэта потым расплачваецца не адно пакаленне моладзі...

І таму трэба як мага раней даведацца аб спецыялізацыі, тонкасцях, цяжкасцях справы, якой збіраешся прысвяціць жыццё.

Калі ў сярэднім ва універсітэце конкурс у апошнія гады тры чалавекі на месца, то на спецыяльнасці правазнаўства, гісторыя, філасофія, журналістыка для школьнікаў ён вельмі вялікі. Цяжка растлумачыць папулярнасць гэтых спецыяльнасцей. Школьнікі засыпаюць нас пытаннямі: чаму, напрыклад, на спецыяльнасцях правазнаўства, журналістыка, філасофія перавага аддаецца асобам, якія ўжо маюць стаж работы на вытворчасці. Але гэта невыпадкова. Пісаць аб людзях або вырашаць часам чалавечы лёс можна толькі, зыходзячы з некаторага жыццёвага вопыту. Школьнікаў на гэтыя спецыяльнасці часта прыцягвае рамантыка. Вось і атрымліваецца, што прахадны бал вельмі высокі. Напрыклад, на спецыяльнасць філасофія ў гэтым годзе склаў 24,5.

А вось агульныя лічбы:

900 медалістаў скончыла школы рэспублікі, звыш 500 паступала ў БДУ, 468 залічана. Кожны чацвёрты студэнт (першакурснік) БДУ — медаліст. Толькі на ФПМ паступіла 123 медалісты. Усяго ва універсітэт на дзённае аддзяленне залічана каля 2000 студэнтаў, па 650 — на вячэрняе аддзяленне і завочны факультэт.

Некалькі слоў хочацца сказаць пра грамадскую прыёмную камісію. Гэта вельмі патрэбны памочнік. Самыя падрабязныя парады і кансультацыі, знаёмства з універсітэтам, яго гісторыяй, рассяленне ў інтэрнатах — за гэта мы былі спакойны. Гэты ўчастак работы ўзначальвала Дзіна Смагіна, студэнтка гістарычнага факультэта.

Першакурснікі! Ваша студэнцкае жыццё пачалося не ў аўдыторыі, а на калгасным полі. Вы пазналі адзін аднаго, пасябравалі, і той мікраклімат, які склаўся ў вас цяпер, пэўна, будзе існаваць ва ўсе гады вучобы. Вам можна пазайздросціць. І зайздросцяць многія, але больш за ўсё тыя, хто прамінуў гэту шчаслівую пару юнацтва. У вас святочны настрой. Здзейснілася мара. У руках — студэнцкі білет, аб якім яшчэ нядаўна толькі марылася.

Але аддавацца марам доўга нельга. Памятайце, вучэнне — адзін з самых напружаных відаў працы. Студэнцкія гады не будуць лёгкімі а, магчыма, нават акажуцца самымі працаёмкімі ў жыцці. Канешне, вы шмат наслухаліся аб прывабнасці студэнцкага жыцця. Канешне, цяжка ўявіць яго без турысцкай палаткі і начлега ля кастра, без заняткаў спортам, без тэатра, кіно. Але своеасаблівасць студэнцкіх гадоў і ў вялікім самаабмежаванні. Вы павінны быць мэтанакіраванымі, бо без гэтага нельга глыбока авалодаць прафесіяй. Магчыма, будуць і расчараванні ў абранай прафесіі. Не заўсёды яе лёгка змяніць, таму трэба быць гатовымі і да прозы прафесіі.

Галоўная небяспека падпільноўвае студэнта ў яго свабодзе размяркоўваць свой час і яго выкарыстоўваць. Ідучы ў ВНУ, кожны настройваўся на ўпартыя заняткі, але з першых дзён расхалоджваўся: пасля школы адчуваў сябе «распрыгоненым», яму пачынала здавацца, што да сесіі яшчэ далёка, што ён усё яшчэ паспее.

Памятайце, што не павінна быць прагалаў у ведах. Паток інфармацыі, якую атрымлівае цяпер студэнт, вельмі вялікі. І не заўсёды лёгка вытрымаць націск гэтага патоку. Прапушчаныя раз-другі лекцыя, семінар або практычныя заняткі (дробязь быццам бы) паварочваюцца паражэннем у час сесіі.

Галоўная задача, якая стаіць перад першакурснікам, — навучыцца вучыцца. Вас будуь вучыць гэтаму, але галоўнае — за вашай воляй і настойлівасцю. Не бойцеся задаваць пытанні — лектар зацікаўлен у іх, не саромейцеся таварыша — ён заўсёды дапаможа.

Закончыць хацелася б выдатнымі словамі акадэміка Канстанціна Іванавіча Скрабіна, якія ён сказаў у выступленні перад студэнтамі: «Калі вы зможаце на працягу ўсяго свайго жыцця захаваць яркую свежасць мыслі, клякочучую энергію, мужнасць, аптымізм, сціпласць, ненасытную прагу ведаў, самаадданую любоў да сваёй працы, чалавецтва, сваёй Радзімы; калі вы зможаце не толькі захаваць, але і абвастрыць густ да ўсяго прыгожага—ці то харáство прыроды, каштоўнасці сусветнай культуры, ці то такія тварэнні чалавечага генія, як навука, мастацтва, літаратура; калі вы, нарэшце, заўсёды будзеце ўспрымаць, асіміляваць усё чыстае, светлае, высакароднае і прагрэсіўнае, то вы на ўсё жыццё захаваеце маладосць!

Будзьце заўжды маладымі, бо маладосць ва ўсіх відах цудоўна».

**У. ВОДНЕЎ,**
адказны сакратар прыёмнай камісіі, дэкан спецфакультэта прыкладной матэматыкі.



Другакурснікі спецфакультэта прыкладной матэматыкі на лабараторных занятках па метадах вылічэння. Ля дошкі М. САМУЙЛІК.

Фота С. Шыдлоўскай.

---

Студэнты універсітэта ў сістэме ваенна-патрыятычнага выхавання праходзяць своеасаблівую школу мужнасці, ідэйнай перакананасці. Гэта школа фарміруе характары, робіць высакароднымі пачуцці, павышае адказнасць за будучыню нашай краіны.

Вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў у летні перыяд праводзяць выкладчыкі універсітэта Б. А. Сяргунін, М. В. Субоцін, В. М. Кузняцоў і іншыя.

Пад іх кіраўніцтвам студэнты устанавілі цесны кантакт з жыхарамі Старадарожскага раёна. Узяўшы шэфства над калгасам, яны аказалі гаспадарцы вялікую дапамогу ва ўборцы ўраджаю. Асабліва

# ЗАСЛУЖЫЛІ ПАДЗЯКУ

вылучыліся на рабоце ў полі студэнты хімічнага і біялагічнага факультэтаў В. Барай, К. Каваленка, А. Баброўскі, А. Зінькевіч, С. Канстанцінаў і іншыя.

Студэнты выступалі з дакладамі перад працоўнымі раёна, удзельнічалі ў канцэрце мастацкай самадзейнасці ў раённым Доме культуры, у клубе калгаса. Канцэрты праходзілі з вялікім поспехам.

За актыўны ўдзел у культурна-масавай рабоце з моладдзю раёна студэнт А. Чыжык узнагароджан Ганаровай граматай райкома камсамола. Граматамі ўзнагароджаны і яшчэ 12 студэнтаў.

Цікава прайшлі спартыўныя спаборніцтвы паміж моладдзю раёна і студэнтамі універсітэта.

Вялікая роля ў правядзенні ўсіх гэтых мерапрыемстваў належыць сакратару камсамольскай арганізацыі студэнту У. Бішуку і актывісту-студэнту У. Шыфману.

На ўрачыстым сходзе, прысвечаным заканчэнню летняй практыкі, старшыня выканкома райсавета дэпутатаў працоўных тав. Бондар уручыў студэнтам адрас на імя рэктара, сакратара парткома, сакратара камітэта камсамола універсітэта, у якім бюро Старадарожскага райкома КПБ Мінскай вобласці, выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных, бюро раённага камітэта камсамола выказваюць падзяку калектыву студэнтаў і выкладчыкаў БДУ за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і аказанне дапамогі гаспадаркам ва ўборцы ўраджаю 1974 года.

**А. БЯДЭНКА.**

---

# ШЭФСКІЯ КЛОПАТЫ

Камітэт камсамола БДУ заўсёды аддае вялікую ўвагу сваім шэфскім сувязям і абавязкам. Пра поспехі ў гэтай рабоце лепш за ўсё сведчаць лічбы. У мінулым годзе ў 32 падшэфных школах Мінскага раёна і вобласці камсамольцамі БДУ было прачытана 750 лекцый, дадзена 411 канцэртаў, 150 выездаў зрабілі агітбрыгады. Школам было перададзена кніг на суму 1500 рублёў. Студэнты дапамаглі абсталяваць 16 спецыялізаваных кабінетаў і класаў, 57 піянерскіх пакояў, музеяў і куткоў баявой славы.

За кожнай з падшэфных школ замацаваны асобныя факультэты, якія і вядуць там работу. Шэфства працягваецца і летам. Ажыццяўляюць яго байцы будаўнічых атрадаў. У гэтым годзе байцы універсітэцкіх атрадаў перадалі школам у зоне дыслакацыі 2300 кніг, дапамагалі рыхтаваць школьныя памяшканні к новаму навучальнаму году, арганізоўвалі піянерскія лагеры-«спадарожнікі», праводзілі з мясцовымі дзецьмі палюбіўшуюся ім «Зарніцу».

Новы навучальны год прынёс з сабой новыя шэфскія турботы. Сёлета да падшэфных школ далучыліся яшчэ тры ГПТВ: №№ 76, 107, 117. Рашэннем камітэта камсамола за імі замацаваны фізічны, матэматычны факультэты і ФПМ. Нядаўна на сваёй першай сустрэчы сакратары камітэтаў камсамола гэтых факультэтаў і вучылішчаў распрацавалі сумесны план работы.

Студэнты — слухачы школы маладога лектара будуць выступаць у гэтых вучылішчах па пытаннях прававога, атэістычнага, ваенна-патрыятычнага выхавання і эканамічнай адукацыі.

Члены СНТ узначаляць гурткі тэхнічнай творчасці і наладзяць работу кансультацыйных пунктаў.

Кожны сектар камітэта камсамола і адпаведныя сектары факультэцкіх камітэтаў абмеркавалі, як лепш арганізаваць сваю частку работы ў падшэфных ГПТВ.

Спартыўна-масавы сектар узяў на сябе арганізацыю іх валейбольных, баскетбольных секцый і секцыі бокса. Зборныя каманды БДУ і ўсіх ГПТВ правядуць гэтай восенню спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на прыз Героя Савецкага Саюза У. Амельянюка, а ўзімку — «малую» зімовую алімпіяду.

Шэфскі сектар плануе «дні адкрытых дзвярэй» на сваіх факультэтах правесці менавіта для навучэнцаў гэтых вучылішчаў. Культмасавы сектар дапаможа арганізаваць вечары адпачынку і гурткі мастацкай самадзейнасці.

Члены турысцкага клуба правядуць сумесныя зорныя паходы і разам з навучэнцамі ГПТВ будуць удзельнічаць ва ўсесаюзным агітпаходзе «Мая Радзіма — СССР». Штаб працоўных спраў разам з турклубам БДУ правядзе ў вучылішчах вечары сустрэч байцоў СБА і турыстаў універсітэта.

Праз некалькі дзён у камітэце камсамола БДУ зноў сустрэнуцца сакратары камсамольскіх арганізацый шэфаў і падшэфных і падвядуць першыя вынікі сумеснай работы.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

---

# ПЛЁН СУМЕСНЫХ НАМАГАННЯЎ

## З ВОПЫТУ КУРАТАРА

Работа куратара на першым курсе вельмі спецыфічная. Учарашні абітурыент-школьнік прыйшоў у мнагалюдную сям'ю студэнтаў. Ён многа чуў аб тым, што студэнцкае жыццё асаблівае, што гэта лепшая пара ў жыцці чалавека. У школе ўсе дзесяць гадоў вучобы малады чалавек ведаў, што трэба рабіць, як вучыцца і праводзіць свой вольны час. Там, пачынаючы з першага класа, маці, настаўніца, піянерважатая дапамагалі яму ў гэтым. Але вось ВНУ! На лекцыю кожныя дзве гадзіны ўваходзіць новы выкладчык, бярэ мел або без яго тлумачыць пра тую навуку, якую ён выкладае, лічачы, што яна самая галоўная для студэнта і ведаць яе трэба абавязкова. Выкладчык не дзеліць свой час на апытанне і тлумачэнне новага матэрыялу, не выяўляе, як засвоілі вы змест папярэдняй лекцыі. Ён чытае. Трэба паспець пачуць, зразумець і запісаць самае галоўнае, г. зн. трэба ўмець пісаць канспект. А далей — бібліятэка, чытальная зала. Як там атрымаць кнігі, як лепш працаваць над літаратурай, выкарыстоўваючы канспект?

І яшчэ — ёсць гурткі навуковыя, мастацкай самадзейнасці, спартыўныя секцыі, кіно, тэатры, музеі і філармонія, мастацкая літаратура і многае, многае іншае. А ў сутках 24 гадзіны. Як лепш спланаваць свой час? Да таго ж для многіх студэнтаў (не мінчан) зусім новае становішча — няма побач твайго вялікага сябра і дарадчыка — мамы, няма старых таварышаў. Усё аказалася новым, і нехта павінен дапамагчы студэнту. Гэтым чалавекам і з'яўляецца куратар.

Кожны раз пры першай сустрэчы са сваёй групай, калі на мяне ўтаропленны 25—28 пар збянтэжаных, часта спалохана - насцярожаных вачэй, я адчуваю адказнасць за жыццё гэтых маладых людзей, я павінна ім дапамагчы.

І ўжо на першым сходзе я стараюся караценька азнаёміць студэнта з яго новым жыццём, пагаварыць аб канспектаванні, бібліятэцы, чытальнай зале, аб найбольш рацыянальным распарадку дня. Тут жа група выбірае камсорга, адказнага за паспяховасць, адказнага за правядзенне палітінфармацый. Прапаную прадумаць план работы, г. зн. намеціць мерапрыемствы на семестр — сходы, гутаркі, палітінфармацыі, вечары, культпаходы і г. д. Пры зацвярджэнні плана абавязкова назначаем адказных за мерапрыемства і дату выканання.

Сустракаемся мы на «куратарскім часе» штотыднёва (час і аўдыторыя плануюцца дэканатам). Палітінфармацыі праводзім адзін раз у два тыдні, рыхтуюць іх самі студэнты пры актыўным удзеле куратара. Два разы ў месяц праводзім гутаркі па прапанаваных студэнтамі пытаннях. Гэта ці агляд часопіса «Хімія і жыццё», ці іншая тэма, якая цікавіць групу.

Сходы камсамольскія, з пытаннямі паспяховасці, праводзім раз у 1,5—2 месяцы. Адказны дакладвае аб бягучай паспяховасці, карыстаючыся дадзенымі свайго назірання і меркаваннем выкладчыкаў па асобных дысцыплінах. Тут жа вызначаем канкрэтныя меры, каб аказаць дапамогу слабым студэнтам. За месяц-два да сесіі запрашаем лепшага студэнта - старшакурсніка, які дзеліцца вопытам, як лепш рыхтавацца да экзаменаў.

Вельмі важна з разрозненай групы незнаёмых людзей стварыць згуртаваны калектыў, і ў гэтым вялікую ролю павінен адыграць куратар групы. Не трэба пазбаўляць ініцыятывы саміх студэнтаў, ні ў якім разе не праводзіць мерапрыемствы фармальна. Дрэнна падрыхтаваныя вечары, дыспуты лепш зусім не праводзіць, бо траціцца да іх інтарэс.

Вялікае значэнне для стварэння калектыву маюць вечары ў групах, культпаходы, правядзенне Ленінскага заліку і, канешне, удзел студэнтаў у будаўнічых атрадах.

Вельмі падабаецца мне Ленінскі залік. У групе ў нас ён праходзіць актыўна; пытанні кожнаму студэнту задае ўся група, зазначаючы не толькі станоўчыя, але і адмоўныя бакі характару і паводзін студэнта. Я лічу, што такая крытыка вельмі карысна.

Абавязкова індывідуальная работа са студэнтамі. Трэба як мага раней пазнаёміцца з кожным студэнтам, ведаць, якую школу ён скончыў, дзе жывуць яго бацькі і чым займаюцца, склад сям'і, яе матэрыяльнае становішча, забяспечанасць студэнтаў інтэрнатам і стыпендыяй. Часам прыходзіцца дапамагаць студэнту знайсці жылплошчу.

І далей, на працягу ўсяго навучальнага года індывідуальная работа не менш важна, чым групавая. Трэба ведаць кожнага студэнта, каб своечасова дапамагчы яму паспяхова здаць сесію, заняцца навуковай работай, а часам і разабрацца ў якой-небудзь складанай сітуацыі асабістага характару.

На працягу трох гадоў у курыруемых мной групах быў «малодшы» куратар. Гэта старшакурснік або аспірант. Ён з'яўляецца добрым памочнікам куратара і, акрамя таго, звязваючым звяном, бо па ўзросту бліжэй да студэнта.

Як бачна, кола пытанняў работы куратара вялікае. Безумоўна, тых 100 гадзін, што плануюцца выкладчыку на работу ў групе, недастаткова. Але ёсць яшчэ і іншае, больш важнае — задавальненне ад работы, удзячнасць студэнтаў, адчуванне таго, што ты патрэбен чалавеку.

**Т. ТАРАЙКОЎСКАЯ,**
кандыдат хімічных навук.

# 7 КАСТРЫЧНІКА—25 ГОД З ДНЯ АБВЯШЧЭННЯ ГЕРМАНСКАЙ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

## У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

З 30 верасня ў БДУ пачаўся тыдзень дружбы, прысвечаны 25-годдзю ўтварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

На ўсіх факультэтах праходзяць гутаркі аб поспехах сацыялістычнага будаўніцтва ў ГДР. Актыўны ўдзел у тыдні дружбы прымаюць студэнты ГДР, што навучаюцца ў БДУ. Яны выступаюць у школах, на прадпрыемствах, на факультэтах з цікавымі расказамі аб жыцці сваёй рэспублікі.

Да юбілейнай даты прыўрочана фотавыстаўка, дастаўленая ў БДУ з Іены. Яна расказвае аб гісторыі аднаго са старэйшых універсітэтаў краіны, аб рознабаковых сяброўскіх сувязях Іенскага і Беларускага універсітэтаў.

25-годдзю ГДР будзе прысвечан урачысты сход універсітэцкага калектыву, які адбудзецца 5 кастрычніка. У святочным канцэрце, што завершыць урачыстасці гэтага дня, прымуць удзел савецкія і замежныя студэнты.

Заключае тыдзень навуковая канферэнцыя. З дакладамі на ёй выступяць прадстаўнікі шматнацыянальнай універсітэцкай сям'і.

У гэтыя дні ў Іенскім універсітэце імя Ф. Шылера госціць дэлегацыя БДУ на чале з прарэктарам па вучэбнай рабоце У. Р. Івашыным і сакратаром парткома Т. Я. Дударавай.

**Наш кар.**



Вышынны будынак народнага прадпрыемства «Карл Цэйс Іена» — цэнтр навукова-даследчай работы.

## СЯБРЫ ПАЗНАЮЦЦА Ў ПРАЦЫ

З году ў год летам нашы будаўнічыя атрады працуюць у ГДР, а мы прымаем у сябе групы нямецкіх сяброў. У гэтым годзе СБА «Дружба», які працаваў на будаўнічых пляцоўках г. п. Самахвалавічы, складаўся са студэнтаў БДУ і навучэнцаў Вышэйшай Патсдамскай педагагічнай школы.

Нямецкія сябры ехалі да нас не толькі з жаданнем добра папрацаваць, але і пасябраваць з намі, больш даведацца пра наша жыццё, пазнаёміцца з нашай краінай, расказаць аб сваёй.

Нашы студэнты старанна рыхтаваліся да сустрэчы, збіралі матэрыял аб ГДР, аформілі стэнды пра наш універсітэт і пра студэнцкі будаўнічы рух у нашай краіне.

Амаль месяц да прыезду сяброў мы працавалі самастойна, пачыналі з першага калочка, закладвалі фундамент будынка, каб падрыхтаваць да прыезду нямецкіх рабят шырокі фронт работ.

І вось прыйшоў доўгачаканы час сустрэчы.

Непрыкметна і хутка пераадольваўся моўны бар'ер. Ужо ў першы вечар мы доўга не маглі нагаварыцца. Але дысцыпліна ёсць дысцыпліна. Пара было класціся спаць, бо назаўтра — першы сумесны працоўны дзень.

На аб'екце пасля кароткага інструктажу ўсе разышліся па адведзеных месцах. Працавалі дружна: разам клалі сцены, разам замешвалі раствор. К канцу дня стала ясна: працаваць нашы калегі ўмеюць.

Мы падрыхтавалі да паслуг гасцей шырокую праграму азнаямлення з нашай рэспублікай: правялі экскурсію па гораду-герою Мінску, з'ездзілі ў Брэсцкую крэпасць і на Курган Славы. Вялікія ўражанні ў студэнтаў Патсдамскай педагагічнай школы пакінула наша сумесная паездка ў Хатынь.

Наш інтэрнацыянальны атрад, канешне, вельмі любіў музыку і спевы. Амаль усе мы ўваходзілі ў састаў агітбрыгады.

На канцэртах у Самахвалавічэх поспехам карысталіся выступленні нямецкіх сяброў. Ды мы і самі любілі паслухаць, як спяваюць Марыяна Краза і Марціна Разенау.

Але наш атрад паважалі не толькі за канцэрты. Вынік дружнай працы — будынак, які ўзняўся за лета.

Хутка праляцелі тыдні сумеснай працы. Прыйшоў час развітвацца: нямецкія сябры адпраўляліся ў паездку па Савецкаму Саюзу. Камандзір нямецкай часткі атрада Міхаіл Кёніг, развітваючыся, сказаў:

— Я не ўпершыню ў вашай краіне, і кожны раз пакідаю яе з сумам. Мы ўпэўнены, што маем добрых сяброў у Савецкай краіне...»

Брацкія абдымкі, абмен адрасамі, апошнія поціскі рук. Аўтобус крануўся, і з акна паляцела песня, якую склаў у час працы баец атрада «Дружба» Хатвінк Готшальд.

**У. ПУЗІКАЎ,**
**Е. МЯДЗВЕДЗЕЎ,**
**студэнты гістфака.**

## ДРУЖБА, СУПРАЦОЎНІЦТВА

Шырокі інтарэс чытачоў выклікае па-мастацку аформленая выстаўка, размешчаная ў адной з залаў універсітэцкай бібліятэкі. Тут сабрана вялікая колькасць перыядычных выданняў, новых кніг, твораў нямецкіх паэтаў і празаікаў.

Для тых, хто жадае папоўніць свае веды аб знешнепалітычным жыцці ГДР, яе сяброўскіх сувязях, сацыялістычным будаўніцтве, прапануецца шэраг зборнікаў. Так, напрыклад, матэрыялы VIII з'езда Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі і міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый расказваюць аб мэтах і задачах нямецкага народа на шляху будаўніцтва сацыялізму. З'яўляючыся членам СЭУ, Германская Дэмакратычная Рэспубліка ў садружнасці з краінамі сацыялістычнага адзінства вядзе пракладку новага газаправода, экспартуе навейшую тэхніку для аснашчэння заводаў і фабрык.

Маляўніча ілюстраваныя часопісы паказваюць новабудоўлі жылых кварталаў, стужкі шасэйных дарог і магістраляў.

Для больш дэталёвага знаёмства чытачоў з дружалюбнай рэспублікай афарміцель Н. М. Славінская ўдала скампанавала другую палавіну выставачнага стэнда, якая апавядае аб культурна-мастацкім жыцці ГДР. Ілюстрацыі часопісаў расказваюць аб буйнейшых культурных цэнтрах, архітэктурных помніках, служаць наглядным дапаўненнем да апісання поспехаў рэспублікі. Тым, хто цікавіцца мастацтвам і літаратурай ГДР, прапануюцца брашура А. Замяціна і С. Клімава «Скарбы Дрэздэнскай галерэі», серыя новых выданняў твораў нямецкіх паэтаў, кнігі А. Зегерс, А. Цвейга, Ф. Фюмана, В. Брэдэля.

**С. ІВАНОВА.**

# КРОК У САМАСТОЙНАСЦЬ

Пяты курс... Апошняя прыступка перад вялікім самастойным жыццём. Якім яно будзе? Канешне, не без цяжкасцей. У кожнага будуць свае памылкі, засмучэнні і радасці, новыя поспехі і адкрыцці. На пятым курсе студэнты глыбей і шырэй пазнаюць асновы сваёй будучай прафесіі. Гэтаму ў многім дапамагае педагагічная практыка.

У школе № 115 праходзяць практыку восем студэнтаў гістарычнага факультэта. Дзяўчат — Фаціму Радлінскую і Таню Сліжэўскую мы знайшлі ў настаўніцкай. Яны рыхтаваліся да ўрока. Задаём ім традыцыйнае пытанне:

— Чаму вы вырашылі стаць педагогамі?

Таня, тут Таццяна Андрэеўна, светлавалосая, блакітнавокая, з мяккім спакойным голасам, адказвае:

— Стаць настаўніцай я яшчэ ў школе марыла. Асабліва любіла гісторыю, вельмі хацелася і самой вучыць дзяцей. Вось цяпер, здаецца, мары мае збываюцца.

Вельмі таварыская Фаціма гаворыць:

— Працаваць з дзецьмі вельмі цікава, яны ўсе такія розныя, дапытлівыя, начытаныя. Мы вельмі пасябравалі з рабятамі, з выкладчыкамі, цяжка будзе цяпер расставацца,—на хвіліну Фаціма адвярнулася: падышла яе настаўніца, памочнік і старэйшы таварыш, настаўніца гісторыі Фаіна Міхайлаўна Кротава.



— Што я буду рабіць без Фацімы Міхайлаўны? Я так прывыкла да яе, палюбіла. Фаціма добрасумленная, працавітая, сціплая дзяўчына. Вельмі дапамагае мне.

— Ведаеце, — працягвае Фаціма, — першы раз, калі я прыйшла ў клас — гэта было ў мінулым годзе, на чацвёртым курсе, — баялася, а што калі не атрымаецца, не змагу даць урок, рабяты не зразумеюць мяне?

Але вельмі дапамог нам калектыў настаўнікаў. Адразу адчула сябе, як дома, склалася такая дружалюбная атмасфера падтрымкі, дапамогі, узаемаразумення. .

— Так, канешне, былі і хваляванні, і боязь, — гэта ўжо гаворыць Таня, — але хутка ўсё прайшло. Пачынаеш асвойвацца, прывыкаеш да людзей, і здаецца, не так ўжо ўсё і складана. Не ўтаю: былі і памылкі, нешта часам не атрымлівалася, але побач заўсёды аказваліся старэйшыя таварышы, вопытныя педагогі. Вельмі дапамагаюць мне ў рабоце парады дырэктара школы Рыгора Сцяпанавіча Ракава, з якім я працую ў пятых класах. Дапамагаюць нам і ўказанні нашага метадыста Леаніда Сямёнавіча Храловіча...



Да нас падыходзіць Наташа Бендзь. Яе падапечныя—неспакойныя сямікласнікі.

— Наташа, ці ёсць у вас любімыя вучні, як вы адносіцеся да іх?

Наташа збянтэжана ўсміхаецца:

— Канешне, з усіх вучняў неяк міжволі вылучаеш «любімчыкаў». А ўвогуле я ўсіх люблю. З рабятамі мне цікава, яны такія неспакойныя, хочуць многа ведаць, захапляюцца музыкай, тэхнікай...

— Дзяўчаты, а самі вы што больш за ўсё любіце, чым займаецеся ў вольны час?

— Я стараюся вольныя хвіліны праводзіць са сваімі вучнямі, — гаворыць Фаціма. — Многа часу забірае пазакласная работа. Ходзім з рабятамі ў кіно, у музеі, гутарым аб кнігах, аб жыцці. Вельмі люблю чытаць.



Хочацца бачыць сваіх вучняў разумнымі, добрымі, смелымі. Калі сустракаеш сапраўднага чалавека ў поўным сэнсе гэтага слова, на душы неяк цяплее. Але вось калі будзеш усведамляць, што ў выхаванні лепшых якасцей гэтага чалавека ёсць частка і тваёй працы, — ты проста шчаслівы, — гаворыць Таня.

Настаўнік... Гэта не проста слова, гэта — званне. І быць дастойным яго — вялікі гонар. І можна спадзявацца, што нашы знаёмыя дзяўчаты апраўдаюць яго сваёй працай і стараннем. Пацвярджэнне гэтаму — водгукі аб іх педагагічнага калектыву школы.

«Прыроджаны педагог, у ёй закладзен прафесіянальны талент», — так сказаў аб Таццяне Сліжэўскай дырэктар школы.

Вельмі задаволены практыкантамі выкладчыкі школы.

**І. САВЕТКІНА,**
**А. КОНДРУСЕВА,**
студэнткі-вячэрніцы журфака.

**НА ЗДЫМКАХ:**

**Перад урокам неабходна яшчэ раз прагледзець падручнік...**

**Уважліва слухаюць расказ Наташы Бендзь сямікласнікі.**

**Заўжды дарэчы дапамога вопытнага педагога: Таня Сліжэўская кансультуецца з настаўніцай гісторыі Галінай Аляксееўнай Тарошчынай.**

Фота **А. Цыгулёва.**

# КАСТРЫЧНІЦКІ КАЛЯНДАР

**1 кастрычніка** — 25 год з дня абвяшчэння (1949) Кітайскай Народнай Рэспублікі.

**3 кастрычніка** — 150 год з дня нараджэння І. С. Нікіціна (1824—1861), рускага паэта.

**4 кастрычніка 1957 г.** — у СССР зроблен паспяховы запуск першага ў свеце штучнага спадарожніка Зямлі.

**5 кастрычніка** — 55 год з дня адкрыцця (1919) II з'езда РКСМ.

**6 кастрычніка** — ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА.

**7 кастрычніка** — 25 год з дня абвяшчэння (1949) Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

**11 кастрычніка** — 30 год назад (1944) Тувінская Народная Рэспубліка прынята ў склад СССР (цяпер Тувінская АССР).

**11 кастрычніка** — 5 гадоў назад, 11—18 кастрычніка 1969 г., у Савецкім Саюзе зроблен многасутачны групавы палёт касмічных караблёў «Саюз-6», «Саюз-7», «Саюз-8» з экіпажамі ў складзе касманаўтаў Г. С. Шоніна, В. Н. Кубасава, А. В. Філіпчанкі, В. Н. Волкава, В. В. Гарбаткі, У. А. Шаталава і А. С. Елісеева.

**12 кастрычніка 1967 г.** — Вярхоўны Савет СССР прыняў новы Закон аб усеагульным воінскім абавязку.

**12 кастрычніка** — 10 год назад (1964) у Савецкім Саюзе на арбіту спадарожніка Зямлі ўпершыню ў свеце быў выведзен трохмесны пілатуемы касмічны карабель «Усход» з экіпажам у складзе В. М. Камарова, К. П. Феакцістава, Б. Б. Ягорава.

**12 кастрычніка** — 50 год з дня ўтварэння (1924) Малдаўскай АССР; з 1940 г.—Малдаўская ССР.

**13 кастрычніка** — УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

**14 кастрычніка** — 50 год з дня ўтварэння (1924) Таджыкскай АССР; з 1929 г. — саюзная ССР.

**14 кастрычніка** — 5 год назад (1969) у адпаведнасці з праграмай супрацоўніцтва сацыялістычных краін у галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах у Савецкім Саюзе быў зроблен запуск штучнага спадарожніка Зямлі «Інтэркосмас-1». Пачатак практычнай рэалізацыі праграмы «Інтэркосмас».

**15 кастрычніка** — 160 год з дня нараджэння М. Ю. Лермантава (1814—1841), рускага паэта.

**17 кастрычніка** — 125 год з дня смерці Фрыдэрыка Шапена (1810—1849), польскага кампазітара і піяніста.

**20 кастрычніка** — ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

**24 кастрычніка** — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ.

**27 кастрычніка** — 50 год з дня ўтварэння (1924) Туркменскай ССР.

**27 кастрычніка** — 50 год з дня ўтварэння (1924) Узбекскай ССР.

**29 кастрычніка** — ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ КАМСАМОЛА.



# СВЯТЛО ВАЧЭЙ ЛЮДСКІХ...

Трэцяя ўсесаюзная выстаўка партрэта адкрылася... Тысячы мінчан, жыхароў вобласці, рэспублікі атрымалі магчымасць пазнаёміцца глыбей з дасягненнямі савецкага мастацтва апошняга часу, зазнаць радасць сустрэч з узнёслымі творамі.

Партрэтны жывапіс поўны асаблівасцей.

Партрэт — вынік вялікіх жыццёвых назіранняў мастака, нават калі твор пішацца з канкрэтных людзей, бо, па словах Ф. Дастаеўскага, толькі «ў рэдкія хвіліны жыцця чалавек бывае падобны на сябе».

Выстаўка адкрылася... Паток гледачоў ўліваецца ў ярка асветленую залу, дзе мноства аддзелаў — РСФСР, УССР, Беларусь і г. д. Карціны, што вісяць на сценах, — лепшыя з лепшых твораў апошняга часу. В. !ваноў, Т. Салахаў, О. Тэры, С. Эйдрэгявічус, Г. Ханджан, А. Мельнікаў і яшчэ дзесяткі імён. Нават мала спрактыкаванаму ў пытаннях мастацтва гледачу зразумелы вобразы, створаныя савецкімі мастакамі. Бо на палотнах сённяшняй выстаўкі — людзі працы: ці то даяркі, муляры, ці то артысты, пісьменнікі. Мноства імён — «Святлана», «Цётка Эльжбета», «Нарынэ», «Паляўнічы» і мноства вачэй — разумных, глыбокіх, гарэзлівых, вачэй нашых сучаснікаў і людзей, якія ўжо сталі гісторыяй.

...Да гэтага партрэта падыходзіш пацíху, павольна. Углядаешся ў блакітна-дымчатыя вочы, што глядзяць не на цябе, не ў залу, а туды, у невядомую далечыню.... Дык гэта ж Блок!

Мастак А. Ігнацьеў напісаў твор у некалькі рамантычным плане. Карціна вытрымана ў гаме блакітна-зеленаватых, сініх, фіялетавых адценняў. Вечар, бліскаўкі фанароў на паўзмрочнай вуліцы, трапяткія нервовыя пальцы паэта на рукапісе; потым позірк узлятае да бледнага твару Блока, на якім—любоў, пяшчота, боль, чаканне...

Опять, как в годы
золотые,
Три стёртых треплются
шлеи...

Зусім інакш вырашыў свой твор І. Сярэбраны. Большую частку палатна займае сцяна, белая, чыстая. У канцы, як моцны акорд, чорны квадрат піяніна і выразны сілуэт ахопленага натхненнем чалавека: вочы закрыты, твар засяроджаны, рукі ў палёце над клавіятурай. «Святаслаў Рыхтэр»...

Значна адрозніваецца па кампазіцыі, танальнасці і асвятленню карціна народнага мастака СССР М. Божыя «Бетховен». Каларыт партрэта неспакойны. Ён трымаецца на двух дамініруючых танах — светла-фіялетавым і чорным. Гэтыя фарбы падкрэсліваюць напружаны рытм карціны, які пранізвае ўсе дэталі, падкрэслівае імклівы рух кампазітара, бег маланкі ў небе. Садзейнічае ён і метафарызацыі: грыміць гром, бушуе навальніца ў прыродзе — гучыць у душы Бетховена яшчэ не пакладзеная на паперу сімфонія.

«Блок», «Рыхтэр», «Бетховен»... Гэты спіс можна прадоўжыць. Аднак расказаць аб усіх выдатных партрэтах немагчыма.

Яшчэ і яшчэ разглядаеш палотны. Ззяе залацістымі фарбамі «Партрэт Вінаградавай» Г. Піменава, цёпла, з любоўю перадае вобраз народнага майстра У. Мукадасава заслужаны дзеяч мастацтваў Таджыкскай ССР І. Лісікаў, яркія фарбы вызначылі светлы, радасны настрой «Партрэта паляўнічага» В. Пятрова-Маслакова, цікавае маляўнічае рашэнне знойдзена Л. Сарапуу для рамантычнай «Флоры».

«І ўсё ж такі беларускі партрэт добры!» — гэта запіс з кнігі водгукаў. Так. Мастакі нашай рэспублікі вылучылі на трэцюю ўсесаюзную лепшыя работы І. Стасевіча, А. Заборава, В. Пратасені.

Адзіны ў сваім родзе твор В. Стальмашонка «Чарвякоў у У. І. Леніна». Выразны малюнак вачэй, злітная кампазіцыя; пластычны аб'ём фігур Уладзіміра Ільіча, Крупскай, Чарвякова перададзен з дакладнасцю прачаканенай скульптарам бронзы.

... Партрэты, партрэты.... Вялізныя — на ўсю сцяну — палотны, тоўстыя дубовыя рамы. Але ў самым кутку залы позірк абавязкова спыніцца на маленькай, амаль непрыкметнай карціне. Шырока расплюшчаныя бліскучыя вочы. У іх глыбіні—увесь свет, здзіўляючы і захапляючы. Адтапыраныя вушы, і вусны, прыпухлыя па-дзіцячаму... Гэта «Студэнт» А. Горскага. Кожны наведвальнік цудоўнай выстаўкі абавязкова пастаіць перад карцінай і добрадобра ўсміхнецца. Мабыць, пазнае на ёй сябе, учарашняга або сённяшняга...

**С. УСЦІНОВІЧ,**
**студэнтка.**









● В. І. Стальмашонак. Чарвякоў у У. І. Леніна.

● Г. Н. Шырокаў. Партрэт мастака Каваленкі.

● В. Пятроў-Маслакоў. Партрэт паляўнічага.

● В. Варэцкі. Косаўскія керамісты.

Фота няштатнага карэспандэнта **М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**

# ТАШКЕНЦКІ ТЫДЗЕНЬ

Напярэдадні знамянальнай даты — 50-годдзя Узбекскай ССР і Кампартыі Узбекістана Ташкенцкі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна арганізаваў тыдзень дружбы універсітэтаў краіны. У сталіцу Узбекістана з'ехаліся прадстаўнікі ўсіх пятнаццаці саюзных рэспублік. Нашу дэлегацыю з 12 чалавек узначальвалі загадчык кафедры палітэканоміі У. К. Драчоў і выкладчык кафедры дацэнт А. Г. Сімашчанка.

Больш цёплай сустрэчы, чым тая, што чакала нас у Ташкенце, мы не маглі сабе ўявіць. Нас віншавала вялікая група дзяўчат у нацыянальным адзенні, кветкамі.

У наступны дзень — знаёмства з горадам. Глыбокае ўражанне пакінула наведанне музея У. І. Леніна і паездка ў Чыланзар — раён, нанава пабудаваны пасля землетрасення 1966 года. Рабяты паказалі нам квартал, узведзены беларускімі будаўнікамі.

Адкрыццё тыдня дружбы адбылося ў нацыянальным тэатры імя Алішэра Наваі. На ўрачыстым сходзе была аб'яўлена праграма яго правядзення. Назаўтра ў музеі У. І. Леніна адкрылася навуковая канферэнцыя, дзе сярод іншых дакладчыкаў выступілі і нашы студэнты. Асаблівы інтарэс выклікаў даклад пяцікурсніка гістфака Віктара Германчука. На канкрэтным матэрыяле, з мноствам цікавых фактаў ён паказаў баявую садружнасць узбекскага і беларускага народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Журы аднадушна прысудзіла гэтаму дакладу першую прэмію.

Наступны дзень быў асабліва гарачым для нашых артыстаў. Гаспадары і госці фестываля ведалі добрыя традыцыі беларускай маладзёжнай музыкі і многа чакалі ад нашага вакальна-інструментальнага ансамбля «Квазары». Іх спадзяванні, напэўна, апраўдаліся, бо кожны нумар выклікаў бурныя апладысменты, і сцэна была літаральна засыпана кветкамі.

Наш невялікі калектыў (усяго чатыры чалавекі) дзякуючы даволі высокаму ўзроўню выканання, грамадзянскай накіраванасці рэпертуару, а таксама ўмеламу канферансу кіраўніка Уладзіміра Гірэнкі заслужыў высокую адзнаку журы і стаў лаўрэатам фестываля.

Яшчэ адной яркай старонкай фестываля стаў выезд усіх гасцей на ўборку бавоўны. Ленінградцы і масквічы, літоўцы і таджыкі, малдаване і беларусы — усе мы з захапленнем працавалі на бавоўняным полі. Тут мы бліжэй пазнаёміліся з многімі дэлегатамі фестываля. А пасля працоўнага дня прама на полі ўзнік імправізаваны канцэрт, на якім гучалі песні розных народаў нашай краіны.

Як жа хутка праляцеў час! Вось ужо і дзень закрыцця. Падведзены канчатковыя вынікі. Тут нас чакаў яшчэ адзін сюрпрыз: акрамя нашых дакладчыкаў і самадзейных артыстаў, грамату за актыўны ўдзел у правядзенні тыдня дружбы атрымаў член камітэта камсамола, удзельнік дэлегацыі В. Андруховіч.

Як і ў дзень прыезду, у аэрапорце многа узбекскай моладзі. Вязём з сабой часцінку сардэчнай цеплыні гасціннага ўзбекскага народа і незабыўныя ўспаміны

**В. ПУЧЫНСКІ,**
**студэнт, член дэлегацыі.**

# ЗАПРАШАЕ ФГП

Факультэт грамадскіх прафесій аб'яўляе прыём студэнтаў на 1974—1975 навучальны год на наступныя аддзяленні:

**харэаграфічнае**
**рэжысёрскае**
**хормайстарскае**
**народных інструментаў**
**піянерскіх важатых**
**суддзяў і грамадскіх інструктараў па спорту**
**грамадскіх інструктараў па ахове прыроды**
**лектараў**

Тэрмін навучання на рэжысёрскім і харэаграфічным аддзяленнях — тры гады, хормайстарскім і народных інструментаў — два гады, на астатніх — адзін год.

Прымаюцца студэнты І—IV курсаў. Закончыўшыя факультэт атрымліваюць пасведчанне і права на работу па спецыяльнасці, атрыманай на адпаведным аддзяленні.

Пачатак заняткаў 15 кастрычніка. Заявы аб прыёме падаваць у камітэт камсамола, пакой № 207.

**Факультэт грамадскіх прафесій.**
**Камітэт камсамола.**

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар. Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 11423. Зак. 1271.